Цана асобнага нумару 20 гр. Pierasyłka apłačana ryčałtam

№ 26 Вільня, Серада 29 Чэрвеня 1932 г. Год VIII (XVI)

Беларуская
КРЫНІЦА
Палітычная, Грамадзкая і Літэратурная Газэта.

Адрэс Рэдакцыі і Адміністрацыі:
ВІЛЬНЯ, Людвісарская 1-19. (Wilno, Ludwisarska 1-19)
Рэдакцыя адчынена ад 9 гадз. ран. да 4 гадз. веч.

Цэны абвестак паводле ўмовы.

„Бел КРЫНІЦА“ каштуе на год—4 зл., на паўгода — 2 зл., на 3 месяцы — 1 зл.. Заграніцу ўдвая даражэй
ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ.

Каля справы Віленскай Беларускай Гімназіі.

Прапазыку Куратара Віл. Школьнага вокругу, зробленую 19.V. сёл. г., каб з Віл. Бел. Гімназіі ўтварыць роўналеглыя клясы пры віленскай польскай гімназіі ім. Славацкага, Агульны Сход Бацьк. К-ту Віл. Бел. Гімназіі на сваім надзвычайным сходзе 27.V. аднагалосна адкінуў і зьвярнуўся з просьбай да таго-ж Куратара, каб не забіраць гэтай гімназіі ў рукі дзяржавы і пакінуць яе надалей уласнасьцяй беларускай, дапамагаючы ёй існаваць з дзяржаўнага скарбу. Куратар, да гэткага беларускага становішча аднёсься адмоўна і далей уважае за патрэбнае Віл. Бел. Гімназію забраць у рукі дзяржавы, як аб гэтым заявіў ён паслу Ф. Ярэмічу, каторы адведаў яго дзеля высьвельня гэтай справы. Ёсьць так-жа чуткі, што той-жа Куратар, з увагі на магчымую беларускую стойкасьць у абароне самастойнасьці сваей гімназіі, мае намер арганізаваць паралельныя беларускія клясы пры польскай гімназіі ім. Славацкага і назваць гэта беларускай гімназіяй. А што датыча Віл. Бел. Гімназіі, як беларускай прыватнай, то калі і будзе пазволена ёй існаваць, дык ня будзе ей давацца ніякай дапамогі з дзяржаўнага скарбу.

Гэткае становішча ўладаў да бел. гімназіі слушна перапалохала беларускае грамадзянства. Паказаў так-жа свой „перапалох“ і Прэзыдыюм Бацькаўскага К-ту Віл. Бел. Гімназіі, злoжаны ў большасьці з давераных польска-беларускай угоды. „Перапалох“ свой Прэзыдыюм К-ту гэтага выказаў у адкрытым лісьце („Бел. Звон“ 19.VI 31), у якім „ратаваць“ беларускую гімназію заклікае аднаго з лідэраў беларуска-польскай угоды, які ў гісторыі Віл. Бел. Гімназіі адыграў роль дужа сумную, бо гімназія гэта бадай заўсёды служыла яму за палітычную базу. Вось-жа ясна, што гэна выступленьне Прэзыдыюму Бацьк. К-ту было апошняй стаўкай на польскі ўрад і адначасна апошняй і безнадзейнай спробай рэгабілітаваць лідэра староньнікаў польска-беларускай угоды прад беларускім грамадзянствам. Але гэты нумар, як і трэба было спадзявацца, не прайшоў і той лідэр ад зробленай яму прапазыкі стацца кіраўніком і ратаўнікам гімназіі — „адмовіўся“.

Тымчасам лідэры беларуска-польскага кірунку, акачальна такім чынам скампрамітаваныя сваім угадовым кірункам, бо аддаўшыя многа, а не атрымаўшы нічога, Прэзыдыюму Бацьк. К-ту, злoжанаму ў большасьці з іх-жа людзей, „парадзілі“ склікаць Агульны Сход бацькоў, паручыць яму лёсы гімназіі, а самым набегба ўцячы за тры дні перад апошнім тэрмінам падачы кандыдата на дырэктара гімназіі.

Так і сталася. 26.VI. сёл. г. Прэзыд. К-у гэтага, а ў яго імені беларуская полёнофілія, проста ўцёк з фронту барацьбы за далейшае існаваньне гімназіі. Ня стала ў „нашых“ полёнафілаў адвагі змагацца з панамі паложэньня ды ім, відаць, і не выпадала гэтага рабіць. Галоўным іякненьнем беларуска-польскай угоды на гэным Агульным Сходзе беларускіх бацькоў было ўзложыць далейшую адказнасьць за гімназію на беларускае грамадзянства незалежнае, якое, як ведама, беларускімі сакатарамі ад гімназіі гэтай было адпіхана і да яе кіраўніцтва не дапускана. Ведама, галоўным віноўнікам сяньняшняга лёсу нашай гімназіі зьяўляецца сама польская палітыка, але бадай ня менш вінаваты ў гэтым і беларуска-польскі кірунак, які на гэну палітыку паставіў сваю карту і які гэнай палітыцы аж да астатку паверыў лёс беларускай гімназіі.

Урэшце аднак на тым-жа Агульным Сходзе быў выбраны новы Прэзыд. К-ту беларускіх бацькоў і апякуноў, на які ўзложаны абавязак клапаціцца аб далейшым існаваньні гімназіі і які ў ягонай сапраўды труднай працы — ня сумляваемся — і падтрымае ўсё беларускае грамадзянства.

Які будзе вынік працы гэтага Прэзыд. К-у у кірунку ратаваньня гімназіі, згадаць трудна. Надта магчыма, што сіла большая яго пераможа. Гэта быць можа, але ня можа быць і не павінна быць, каб Камітэт гэты, а разам з ім усё беларускае грамадзянства, сіле гэтай паддаўся-б самахоць.

Тое-ж самае павінен зрабіць і Бацькаўскі К-т Беларускай Навагрудзкай гімназіі.

Або жыць маюць нашы гімназіі, або памерці. Калі-ж памерці, дык з гонарам... Ганаровая-ж сьмерць нашых гімназіяў у далейшым беларускім адраджэньні будзе ва на ўскрашэньне...

к

Нацыянальны элемэнт у царкоўным жыцьці.

(Працяг, гл. № 24 „Бел. Крыніцы“).

Сярод праваслаўных беларусаў няма такіх, што імкнуцца да замены багаслужэбнае славянскае мовы на мову беларускую. Рэч ідзе толькі аб пропаведзях, навучаньні рэлігіі ў школах, кансысторскім дзелаводзтве і наагул аб зносінах кансысторыі з благачыннымі і духавенствам, а апошняга — з народам у мове беларускай.

Абураючыся процiў такіх умеркаваных дамаганьняў праваслаўных беларусаў, не закранаючых багаслужэбнае мовы, „Słowo“ цынічна выказвае надзею, што некаторыя цэрквы будуць пераходзіць на польскую мову ў багаслужэньні. Такім чынам чужому да народу расейскаму духавенству прапануецца пакуль-што карыстацца ў рэлігійным жыцьці праваслаўных беларусаў расейскай мовай і паступова замяніць яе мовай польскай, нават у багаслужэньні. Вось за што „Słowo“ так хваліць сучасны склад расейскага духавенства і так баіцца беларускага.

Практычнае значэньне рэлігійнага чыньніка выяўляецца ў тым, што ён даходзіць да найінтымнейшых старон народнае душы, аднолькава ўплывае, як на дарослых, так і на дзяцей, і яго чыннасьць дасягае найглухшых закуткаў. Як-жа гэта рэлігійны чыньнік можа ўплываць на простую душу ў чужой для яе мове?

Нас ня дзівяць погляды „Słowa“, якое кіруючыся выключна шовіністычна-палітычнымі мэтамі, ня мае нічога супольнага з хрысьціянскаю мораль ю, але з сумам прыходзіцца сьцьвердзіць факт, што асобы кіруючыя Віленскай епархіяй — з выключна беларускім праваслаўным карэнным насельніцтвам — карыстаюцца ў сваей дзеяльнасьці гэтымі-ж поглядамі.

Доказам гэтага служаць між іншым адкрыта сказаныя Віленскім архіепіскапам словы: „какие белоруссы? Я не понимаю, — все вы могли бы быть хорошими русскими...“ З такою-ж пагардаю да беларускага народу было сказана „говорите со мною о чем хотите, только не о белоруссах и не о белоруссизации“...

Каб дагадзіць панам з „Słowa“, у ахвяру іх палітычных мэтаў прыносіцца найдаражэйшы скарб праваслаўных беларусоў — іх вера. Кіраўнікі духовага жыцьця народу нічагусенька ня робяць дзеля паглыбленьня хрысьціянскае маралі сярод праваслаўных, але быццам наўмысна робіцца ўсё, каб адпіхнуць народ ад царквы, задушыць у ім усякія праявы рэлігійнасьці: падтрымоўваюцца найболей неадпаведныя, нарожыя да беларускага народу адзінкі сярод духавенства, у зародку душацца ўсякія праявы блізасьці духаўніка да народу на грунце нацыянальным. Каб выклікаць нездаваленьне праваслаўнага насельніцтва, трымаюцца ў прыходах духаўнікі народам нялюбімыя і як шчэпкі выкідаюцца з прыходаў тыя, якіх народ любіць і шануе. Культывуецца тып духаўніка—аб якім „Kur. Wil.“ слушна піша, —„бескарысны для верных і дзяржавы урадавец.“ Загады кансысторыі заклікаюць духавенства не да барацьбы з бязбожжам і бязвер'ям, а да спаганяньня кансысторскіх падаткаў. Віленскай касысторыяй выданы загад, у якім гаворыцца, што нагараджацца (крыжамі, пратаіерэйствам і г. д.) будуць толькі тыя духаўнікі, якія акуратна будуць плаціць кансысторскія падаткі. Становіцца жудасна пры думцы, на якую нізкую ступень маральнага роўня апусьцілася епархіяльнае кіраўніцтва, нагараджаючы духавенства не за яго барацьбу з бязбожжам, не за яго карысны ўплыў на прыхаджан, а за акуратнае спаганяньне падаткаў на кансысторыю. Пры перамяшчэньні духаўніка на іншы прыход ставіцца варункам ня пропаведзь, не законавучыцельства, не маральнае жыцьцё духаўніка, не яго уплыў на верных, а акуратная заплата „залегласьці.“ Такая палітыка ўносіць страшэнную дэмаралізацыю ў духавенства і народ.

Ці можна дзівіцца пасьля гэтага, што цэрквы пустуюць, што частку духаўнікоў народ лічыць сваімі першымі ворагамі, што ніякага ўплыву на народ большасьць духаўнікоў ня мае, што лепшая ідэйная частка духавенства перажывае страшэнную трагедыю, але будучы прыдушана кансысторскімі загадамі змушана маўчаць.

Ці можна дзівіцца, што вынікам такога паложэньня, як адзначае „Kur. Wil.“, зьяўляецца страшэнны занепад рэлігійнасьці сярод праваслаўных беларусаў, а ў сувязі з гэтым — паніжэньне паміж імі моральнасьці, праступстваў, бязбожжа, доказам чаго служыць нішчэньне прыдарожных і могілкавых крыжоў і нават падпаленьне сьвятыняў.

„Дзе, пытаецца „Kur. Wil.“, гэтыя людзі могуць навучыцца хрысьціянскай маралі? У царкве? Але-ж цэрквы стаяць пустыя, бо людзі адапхнуты ад цэрквы чужымі для сябе духаўнікамі, нядобрым прыкладам іх жыцьця, іх зьдзірствам.“

Каму можа быць карысьць ад праводжанай „Słowam“ і ўпорыста праводжанай Віленскай праваслаўнай епарх. уладай царкоўнай палітыкай? Царкве, дзяржаве? Апрача згубы, ні Царква, ні Народ ад такой палітыкі нічога ня маюць і мець ня могуць. Дзе пустуюць сьвятыні, там перапоўнены турмы крымiналістымі.

Палітыка сполёнізаваньня беларускага народу праз Цэркву выклікае толькі варожасьць да царкоўных і дзяржаўных уладаў і адбівае народ ад Цэрквы. Беларускі народ перажыў ня мала цяжкіх хвілін у сваей шматпакутнай гісторыі. Знойдзе ён у сабе сілу і цяпер адбіцца ад плянаванае „Słowam“ і праводжанае ў жыцьцё чужым духавенствам навалы.

Небясьпека пагражае ўжо ня толькі Праваслаўю, але хрысьціянскай культуры на нашых землях наогул. І таму ўсе людзі, у якіх рэлігійнасьць пераважае ўсе іншыя пытаньні, павінны павясьці з злом, разбураючым духовае жыцьцё нашага народу, рашучую барацьбу.

Рыдз.—віч.

З газэт.

Хочуць чацьвертага падзелу Польшчы.

Газэты пішуць, што ў гданскім сэнаце, калі выступіў польскі дэпутат Чарнэцкі з прамовай, гітлераўцы не давалі яму гаварыць, а калі Чарнэцкі ня сходзіў з трыбуны і гаварыў далей, павадыр гітлераўцаў Грэйзэр крыкнуў: „Пара окончыць з гэтым усім! Мы яшчэ дачакаем чацьвертага падзелу Польшчы"!

Як бачым, адносіны гітлераўскай партыі да Польшчы штораз грозьнейшыя. Цікава яшчэ і тое, што старшыня сэнату на гэтыя словы не рэагаваў. *р.*

З беларускага жыцьця.

З царкоўна-праваслаўнага жыцьця. У Віленскую Дух. Праваслаўную Кансысторыю прыслана згаданай просьба, падпісана сотняю прадстаўнікоў ад прыхаджан Залесьнескага прыходу, Маладэчанскага павету, аб назначэньні ў іх прыход настаяцелям сьвяшч. А. Каўша, беларуса. Прыхаджане Залесьненскага прыходу сьвядомыя беларусы і ня прынялі пяцёх сьвяшчэньнікаў-чужынцоў. Цікава, што Залесяне згаджаюцца ўтрымоўваць сьвяшч. А. Каўша шляхам падушнага самааблажэньня.

Канец школьнага году. 15 г. м. прысьпешаным парадкам кончыўся школьны год у Віленскай вучыцельскай сэмінарыі ім. Фр. Багушэвіча і сама сэмінарыя зьліквідавалася. Вучні з абодвух курсаў разбрыліся па іншых чужых школах.

— 23 г. м. кончыўся школьны год і ў Віленскай беларускай гімназіі.

„Пралескі" — вучнёўская часопіс Віленскай беларускай гімназіі. Чэрвень 1932 г. —Ёсьць гэта першая ад часу разгрому „Грамады", даволі сымпатычная праява творчай саматужнай працы нашай беларускай гімназіяльнай моладзі. Першы сшытак, фармату 18 на 22, бачынаў 16, адбіты на шапірографе. Тытульная бачына прыздоблена даволі густоўным малюнкам; ёсьць так-жа прыгожыя застаўкі. На зьмест першага нумару „Пралескаў" склаліся тры ідэолёгічныя стацьці аб сучасных заданьнях беларускае вучнёўскае моладзі, апісаньне сёлетняй гімназіяльнай экскурсіі на воз. Нарач (і ў „надняпранскія"(!?) вёскі), пара пробаў краснага пісьменства і школьная хроніка.

Рэдакцыйная калегія працуе пад наглядам настаўніка В. Грышкевіча. — Цана нумару „Пралескаў" 50 гр.

З украінскага жыцьця.

Суд над украінскім дзеячам — рэд. Паліевам. У палавіне м-ца чэрвеня с. г. адбыўся ў Львове ў акружным судзе судовы працэс рэдактара ўкраінскай часопісі „Новий Час" Д Паліева, якога польская пракуратура абвінавачвала за дзяржаўную здраду і за прамовы на справаздаўчых пасольскіх вечах. Пасьля тыднёвага разгляду справы, суд засудзіў рэдактара Паліева на 3 гады вастрогу. Абарона супроць гэтага прысуду падала апэляцыю.

Вялікая народная маніфэстацыя. У нядзелю 12 чэрвеня с. г. Аддзел „Рідної Школи" у Тарнопалі ладзіў юбілейнае сьвята (50-тыя ўгодкі). Т-ва „Рідна Школа". На гэту ўрачыстасьць зышлося ўсё сьведамае ўкраінскае грамадзянства м. Тарнопаля і ваколіц. Пасьля Службы Божай, якой пачалася ўрачыстасьць, сфармаваўся паход, у якім брала ўчасьце больш 15.000 народу. Паход гэны заняў уздоўж больш двух кілёмэтраў. У паходзе йграла 16 аркестраў. Пасьля паходу адбылася ўрачыстая акадэмія. Такой вялікай маніфэстацыі Тарнопаль пасьля вайны йшчэ ня бачыў.

Бальшавікі вымардавалі цэлае ўкраінскае сяло пад Кіевам. Польскія газэты падаюць, што адно ўкраінскае сяло, каля Кіева, збунтавалася і не хацела аддаць бальшавіком збожжа. У „збунтаванае" сяло камуністычная ўлада выслала карны аддзел войска, які дакачаў у сяле рэвізіі па хатах, забраў усё збожжа і зложыў яго сярод сяла. Сяляне, хочучы ратавацца ад галоднай сьмерці, напалі на карны аддзел з сякерамі і збожжа адабралі. Тады бальшавіцкі карны аддзел акружыў у рассыпную сяло, і з усіх бакоў пачаў паліць сялянскія будынкі. Калі агонь ахапіў усё сяло, а людзі пачалі з сяла ўцякаць у поле, карны аддзел з кулямётаў пачаў страляць у людзей і такім спосабам вымардаваў усё насяленьне гэтага сяла.

З Польшчы.

Дзяржаўна манапольная гаспадарка і фінансавая палітыка. Паводле „Статыстычных Ведамасьцяў" у Польшчы:

Сьпірытусовы манаполь у 1928-29 бюджэтным годзе выручыў 682 мільёны зл. Утрыманьне адміністрацыі гэтага манаполю каштавала 3 мільёны 732 тысячы зл. У 1930-31 г: — выручыў 560 мільёнаў зл. Адміністрацыя каштавала 5 мільёнаў 11 тысяч зл.

Добры даход дзяржаве і „весела" ў краю.

Табачны манаполь у 1928-29 бюджэтным годзе выручыў — 724 мільёны зл. Адміністрацыя гэтага манаполю каштавала 2 мільёны 702 тыс. зл. У 1930-31 г. выручана 690 мільёнаў зл. Адміністрацыя — 4 міл. 76 тыс. зл.

Вялікі даход мае дзяржава і з курэньня.

Дзяржаўныя лясы ў 1928-29 бюджэтным годзе далі 206 мільёнаў зл. Адміністрацыя каштавала 21 міл. 63 тыс. зл. У 1930-31 г. выручана 132 міл. зл. Расход на адміністрацыю — 25 міл. 468 тыс. зл.

З гэтай статыстыкі відаць, што не малыя даходы польскаму скарбу дае і наш край, бо ў нашым краю шмат лясоў і наш народ не абмінае „манапалькі"—ані плыннай ані дымнай — выпівае і пакурывае.

Відаць так-жа з гэтай статыстыкі, што гэтыя дзяржаўныя даходы з кожным годам зьмяншаюцца, а гэта мусіць толькі таму, што бяднее ў Польшчы народ, бо менш выпівае гарэлкі і скурывае табакі, а лесу ня купляе заграніца і мала зужывае абяднеўшы нутраны рынак. Адзін „поступ" у гэтай статыстыцы кідаецца ў вочы — узрост выдаткаў на адміністрацыю.

Фінансавая палітыка пайшла ў кірунку зьменшаньня абегавых грошай, дзеля ўтрыманьня іхнай вартасьці. У мінулым годзе на дзень 31.XII. у абегу было 1.459,7 міль. зл., а сёлета на дзень 31 траўня—1.360,2 міл. зл. У працягу 5 месяцаў зьменшыўся абег на 99,5 мільёнаў зл. (блізу 100 мільёнаў зл.).

Ці сапраўды зьмяншаецца беспрацоўе? Ужо некалькі месяцаў польскія газэты хваляцца, што ў Польшчы з дня на дзень зьмяншаецца безробоцьце. Але побач з весткамі аб зьмяншэньні безробоцьця, тыя-ж самыя газэты падаюць аб што-раз то новых

inž. Ad. Klimovič:

Samapomač u žyćci narodaŭ. 1)

Biblijnyja prodki žydoŭskaha narodu sroha pakaranymi byli nie zatoje, što załatoje cialo mieli, ale zatoje, što jamu kłanialisia. I siahońnia čałavieku volna imknucca da materyjalnaha dabrabytu, ale nielha ŭsiaho siabie ŭ hetym „dabrabycie" tapić, nielha rabić jaho samametaj, a tolki srodkam da mety praŭdzivaj — harmonii ducha z materyjaj u žyćci dačasnym i pieramohi praŭdy ŭ žyćci viečnym.

Ale jak być siahońnia, kali ŭsie byccam zabylisia nia to što budavać dabrabyt, ale dasłoŭna — stačyvać kancy z kancami? Što było i jość pryčynaj takoha abiadnieńnia? Ci jano siahońnia jość ahulnym i paŭsiemiesnym? I ci minuŭščyna znaje štości padobnaha? A kali tak, to jak z hetaha jana ratavałasia?

Nad usim hetym koratka tut zatrymajemsia.

Najmodniejšym słovam siahońnia jość „kryzys". Havorać ab im rabotniki i fabrykanty, vučonyja i ciomnyja, kupcy i ramieśniki, u chatach i na vulicach,—słovam — usie i ŭsiudy. I heta nie ad siahońnia i nie ad učora. Dziŭnym dziela hetaha moža zdacca, što ludzi dahetul nie dahavarylisia navat, ci samo źjavišča kryzysu jość niečym normalnym, ci chvarablivym. Tak! Siańnia viedama tolki, što kryzys jość zaŭsiodnym nastupstvam vajennych zabureńniaŭ, što jon z časam minaje, pierachodzić i što jon najbolš i najdaŭžej dakučaje tym ludziam, jakija žyvuć raźbita, nia łučačysia ŭ arhanizacyi.

A što moža najcikaviejšaje kamu zdacca, dyk heta toje, što siahońnia cierpić nia tolki biedny — ŭ dahetulašnim značeńni hetaha słova, — ale i bahaty. Tamu lepš i pravilniej budzie nazyvać sučasny stan nie abiadnieńniem a prosta — pierałomam, kryzysam, lichaleććiem.

Paŭsiudnaść i istota sučasnaha kryzysu.

Ahulnaj pryčynaj badaj kožnaha kryzysu, a pieražyvanaha asabliva, źjaŭlajucca vajennyja zabureńni. Tryccać hadoŭ času prajšło, pakul haspadarča supakoiłasia Eŭropa paśla Napaleonaŭskich vojnaŭ. Pruska-francuskaja vajna (1870-71) zakranuła mienšy kusok śvietu i tamu haspadarčaja roŭnavaha nastupiła paśla pieršaha ŭžo dziesiatka mirnych hadoŭ.

Sučasnaje biazładździe jość nastupstvam Suśvietnaj vajny, dyk i vyniki jejnyja hetak vostryja. Adčuvajucca jany siahońnia ŭsiudy, tolki stupień ichnaha ŭspružeńnia ŭ adnym miejscy bolšy, u druhim — mienšy. Najbolš chiba adnak začapiŭ hety kryzys našu niearhanizavanuju biełaruskuju ziemlarobskuju viosku. Dziela hetaha i pryhledzimsia tut da hetaha kryzysu pierad usim z punktu hledžańnia intaresaŭ biełaruskaj vioski.

Što da istoty, a znača i biespasiarednych pryčyn sučasnaha kryzysu treba pierad usim adciemić niasumiernaść pamiž vyrabam i spažyćciom. Ludzi pa vajnie byccam zabylisia: chto, čaho i kolki patrabuje. Prostym vynikam niasumiernaści pamiž vyrabam i spažyćciom (spatrabavańniem) stałasia niasumiernaść cenaŭ za vyraby ziemlarobskaj vytvorčaści z adnaho boku i za fabryčnyja vyraby—z druhoha.

Hetu apošniuju niasumiernaść, viedamuju jnakš jak h. zv. nažnicy, u značnaj miery zavastryła treciaja niasumiernaść, niasumiernaść intelihientnych sił z adnaho boku ŭ radoch producentaŭ (vytvorcaŭ) i z druhoha — ŭ radoch konsumentaŭ (spažyŭcoŭ). Ličba hetak zvanaj intelihiencyi niezraŭnana ŭzrasła pa staranie spažyŭcoŭ materyjalnaha dabra, tady jak vostra adčuvajecca niedastatak hetaje intelihiencyi pamiž vytvorcaŭ hetkaha-ž dabra. Asabliva-ž asiročana z intelihientnych sił vytvorčaść našaje vioski. I tut jość adna z pryčyn, čamu ziemlarobski varstat pracy siahońnia ŭ nas hetak niepapłatny. — Fabryčny promysł abymaje saboj niezraŭnana bolš intelihientnych sił i tamu fabryčnyja pradukty siahońnia hetak niamiłaserna bjuć pa praduktach ziemlarobskich. Patryvaje hetki stan tak doŭha, pakul i ziemlarobskaja vytvorčaść nie ŭpraže ŭ svaje słužby patrebny sabie lik daznanych i sapraŭdy vioscy addanych kulturnych pracaŭnikoŭ.

Kryzys u minuŭščynie.

Pierahlad adnaho tolki prošłaha 19-ha stahodździa pakazvaje nam až dva ŭspomnienyja ŭžo haspadarčyja kryzysy: adzin paśla Napaleonaŭskich vojnaŭ, a druhi — paśla vajny pruska-francuskaj. Charakterna pry hetym, što kryzys zakranaje i abchoplivaje saboj nasampierad tyja płasty nasielnictva i tyja ludzkija zaniaćci, jakija stupianiova daśpiavajučy dachodziać da peŭnaj hranicy hetaha svajho raźvićcia Kali-b hetu spaściarohu možna było dahledzić u kožnaha kryzysu, dyk heta pakazvała-b, što samo źjavišča kryzysu nia jość niečym chvarablivym, ale jość tolki kanieśnym stupianiom da štoraz paŭniejšaha daśpiavańnia. A što moža jšče važniejšaje, dyk sam kryzys nie taki ŭžo i strašny dla taho, chto viedaje jak pry im zachavacca. Heta pakazvaje nam minuŭščyna i heta samaje paćviardžajecca ŭ sučasnaści. — Jak-ža zachoŭvalisia pierad kryzysam razumnyja ludzi ŭ minuŭščynie?

Kryzysovaja fala prošłaha stahodździa (bolš mienš roŭna sto hadoŭ tamu nazad) pačałasia na dalokim zachadzie, u Anhlii, i kaciłasia štoraz dalej, na ŭschod. Anhlija tych časoŭ, taksama jak i siahońnia, była staronkaj pierad usim pramysłovaj. U kraju było šmat i šmat ludziej, što žyli z „ruk-pracy", z pracy u fabrykach. Žyććio tahočasnaha anhielskaha rabotnika nia było błahim, pakul u fabrykach było dosyć pracy. Ale voś nadychodziła dabro i zło ŭ adnej asobie: u fabrycy razhaściłasia mašyna. Skutak byŭ toj, što tam, dzie pracavali i mieli chleb 10 čałaviek, astaŭsia pry mašynie tolki adzin, a rešta apynułasia na bruku, biaz kuska chleba, biez strachi nad hałavoj.

банкроцтвах прамысловых прадпрыемстваў і новых рэдукцыях. Аб новых фабрыках і запатрэбаваньнях людзей на працу гэтыя газэты нічога ня пішуць. Дык дзе-ж гэтыя безработныя, лік каторых з кожным днём зьмяншаецца на бачынах газэт, дастаюць працу?

Трэба ведаць, што работнікам, якія зарганізаваныя ў прафэсыянальныя саюзы, калі яны астануцца бяз працы, па закону належыцца некалькімесячная г. зв. безработная запамога. Такіх работнікаў нямаючых працы дзяржаўнае бюро рэгіструе і выплачвае ім праз час прадбачаны законам запамогу. Калі кончыцца даваньне запамогі, тады работнікаў з сьпіскаў безработных вычырківаюць і „жывіце як хочаце". У сьпісках лік такіх безработных тады зьмяншаецца, але толькі ў сьпісках, бо безработныя, выкарыстаўшы тэрмін безработнай запамогі толькі у гэтых сьпісках „перастае" быць безработным. Словам, гэтае зьмяншэньне безработных адбываецца ў большай меры ў бюрах безработных, чым на рынку працы.

Крывавыя падзеі ў Лапанаве. Дня 5 чэрвеня с. г. ў польскім сяле Лапанаў, каля Кракава, дайшло да крывавых падзеяў. На гэты дзень „Строн. Людове" склікала туды сялян на веча. На веча прыбыло каля 10.000 сялян, але староства веча забараніла. Сяляне пачалі абурацца, а паліцыя— наваадзіць парадак. Сяляне пусьцілі ў „работу" палкі, а паліцыя пачала страляць. У выніку — 5 трупоў і некалькіх раненых.

З заграніцы.

Конфэрэнцыя разбраеньня, якая цяпер адбываецца ў Лёзаньне неспадзявана набірае размаху. Ад самага пачатку пасыпаліся з вуснаў прамоўцаў салодкія словы праектаў разбраеньня і касаваньня военных даўгоў. Але адна бяда, што ніхто ня хоча зрачыся зысківаць гэтых даўгоў і кожны ў сябе дома ўзбруяецца як можа. Якой неабавязваючай у сапраўднасьці пастановай заключыць „разаружаная" гаварыльня гэтыя нарады, пакуль-што нявядома. але спадзявацца нечага пазытыўнага ня прыходзіцца.

Заварушэньні ў Нямеччыне. Як ведама 31 ліпня с. г. маюць адбыцца выбары нямецкага парляманту (Рэйхстагу). Палітычныя партыі даходзяць да найвышэйшага напружаньня. У выніку гэтага пачынаюцца заварушэньні. Гітлераўскія баёўкі (штурмовыя аддзелы) заўзята дэманструюць перавагу уплываў нац.-соцыялістычнай партыі. Між паліцыяй і гітлераўцамі і між гітлераўцамі і камуністамі даходзіць да перастрэлак. У выніку гэтых перастрэлак бываюць забітыя і раненыя.

Рэвалюцыя ў Чылі, якая пачалася некалькі тыдняў таму, пакульшто ня выкляравалася. Да гэтай пары перамагае ўрадавае войска. Ёсьць забітыя і многа раненых.

Справа нацыянальных меншасьцяў. Дня 15 чэрвеня с. г. у англьскай палаце лёрдаў адбылася вялікая нарада ў справе абароны нацыянальных меншасьцяў. Прадстаўнік Лябур Партыі лёрд Ноэль Бокстон прадставіў палажэньне нацыянальных меншасьцяў у Польшчы, Югаславіі і Чэхаславаччыне. У сваёй прамове Ноэль Бокстон падкрэсьліў, што Гданск стаўся парахоўняй Эўропы. У канцы высказаліся прамоўцы, што трэба стварыць спэцыяльныя публічныя правы для нацыянальных меншасьцяў.

У С.С.Р.Р., пасьля апошніх дэкрэтаў аб свабодным гандлю сялянскімі прадуктамі, сяляне пачалі ўцякаць з „калхозаў". Пасьля гэтага пачалася нарады ў Маскве, каб не дапусьціць да дабразвольнай ліквідацыі „калхозаў". Чакаюць там новых рэпрэсіяў супроць гэтага ўцяканьня.

Кароткія навіны.

— Цікавае пісьмо да прэзыдэнта Польшчы надовячы прыслалі 57 вучоных, пісьменьнікаў і палітычных дзеячоў некалькіх эўропэйскіх народаў. У гэтым пісьме яны просяць звольніць ад кары 5 маладых людзей засуджаных на 2—4 гады вастрогу за дэзэрцыю з войска. Усе гэтыя засуджаныя належаць да рэлігійнай сэкты баптыстаў. Вучоныя ў сваім пісьме паклікаюцца на ведамае становішча Польшчы на конфэрэнцыі разбраеньня, дзе прадстаўнік Польшчы заявіў, што ў першую чаргу ўсе народы павінны імкнуцца да маральнага разбраеньня. Вучоныя цьвердзяць, што гэтыя засуджаныя маладыя людзі дзеялі ў духу маральнага разбраеньня, бо не хацелі браць учасьця нават у прыгатаваньнях да вайны.

Польская публічная апінія да гэтага пісьма аднеслася лёгкаважна.

— Газэты падаюць, што прэзыдэнт Зл. Шт. П. Амэрыкі Гувэр наказаў гэтымі днямі амбасадару ў Жэнэве, каб настаяваў на дэлегацыі на конфэрэнцыі разбраеньня дайсьці да ладу, бо калі зьехаўшыеся прадстаўнікі дзяржаў да нічога не дагаворацца, дык Эўропа няхай і ня думае аб зьмяншэньні ёй военных даўгоў.

Уражаньні і разважаньні.

Пераглядаючы старонкі „Бел. Крыніцы" кожны бачыць заметкі аб крыўдах Беларускага Народу. У выніку гэтага з боку пакрыўджанага Беларуса наступае толькі нараканьне і горкае сумаваньне — і больш нічога, гэта ўся яго абарона. Калі раздумаемся, дык зьявіцца пытаньне: да чаго гэткае рэагаваньне давядзе? Праўда, гэты публічны плач і жаль усьведамляе Беларуса ў тым, што ён павінен сачыць за бягучымі справамі і ня губіць з вока свайго ідэалу і прыпамінае, што ён павінен усімі сіламі бараніць належных яму правоў. Але ўсё-ж такі гэткая аргумэнтацыя не здавальняе і астаецца пытаньне: чаму прадстаўнікі Беларускага Народу і розныя беларускія ўстановы ня зьвернуцца да міжнароднай апініі, каторая ўсё-ж такі павінна быць аб'ектыўнай? Спадзяюся, што гэтыя мае пагляды ня ёсьць зусім наіўныя, бо высказваючы іх я апёрся на апініі многіх сьведамых Беларусаў.

Навагрудак. **М. Г.**

АД РЭДАКЦЫІ: Зусім з Вамі згаджаемся. Вашы пагляды зусім не наіўныя. Але Вашы заўвагі толькі пацьвярджаюць чыннасьць цэнтральных беларускіх установаў і прадстаўнікоў народу. Беларускія народныя арганізацыі і прадстаўнікі народу ў гэтай справе ў меру магчымасьці дарогай легальнай усё рабілі і робяць. Падаваны ўжо мэморыялы ў Лігу Народаў, амаль штогод бывае прадстаўнік ад беларусаў на міжнародных кангрэсах нацыянальных меншасьцяў. Гэта ў справе палажэньня Беларусаў наагул. Падаваны так-жа мэморыялы і ў справе рэлігійнага палажэньня нашага народу. Апошнімі часамі беларускі каталіцкі цэнтр падаў мэморыял прадстаўніку Апостальскай Сталіцы, а праваслаўная фракцыя БХД. выслала мэморыял Мітрапаліту Праваслаўнай Царквы ў Польшчы. Словам, робіцца ўсё магчымае.

— У Вашынгтоне (Амэрыка) тайная паліцыя атрымала вестку, што ў Вашынгтон няведамыя людзі вязуць аўтамабілем бомбы і думаюць узарваць палац прэзыдэнта. Паліцыя акружыла палац і пільна яго сьцеражэ.

„Беларуская Крыніца" выходзіць у месяцы ліпні сёл. г. — 10-га і 25 дня.

W. A. 18)

Kaniok-Harbuniok.

XVIII.

Woś sabrałaś śmat narodu.
Jak-by muchi kala miodu,
Pry katłoch burčać, marmočuć,
Zara Janku bačyć chočuć.
Janka zhinuŭsy byŭ niedzie,
Až woś bačuć: „Jedzie, jedzie"!
Zašaptali, marmatali,
Inšy—palcam pakazali.
Kryčać, plaskajuć, śmiajucca;
Nawiet inšy až złujucca,
Što Iwan tak nie śpiašycca;
Baby kažuć: „Jon baicca!"
Try katły stajać hatowy
Ŭžo pad pieršy walać drowy;
Ahoń zara padkładajuć;
Słuhi dźmuchajuć, śpiašajuć.
Razahreŭsia kacioł pieršy;
Małako ŭ im zakipieŭšy,
Až bušuje, piena chodzić...
Wyjšaŭ kniaź, wačami wodzić.
Prykazaŭ druhi katliśča
Padahreć. Ahoń až świšča;
Ŭžo wada kipić, klakoča...
A kniaź Janku zhubić choča,
Kaža: „Leź u pieršy zara!"
Dy jašče krapčej ich wara.
Janka wočy padymaje;
Dy nichto nie špačuwaje:
Usie wočy nie łaskawy —
Ci fałšywy ci cikawy.
Adzin Konik-Harbuniočak
Byŭ łaskawieńni družočak.
Woś Kaniok padskočyŭ zara,
Chwaciŭ ŭ hubu taho waru,
I na Janku tolki pyrsnuŭ,
A sam trejčy mocna świsnuŭ...
Ŭwieś narod praniaŭsia žacham,
Ale Janka, tym-ža macham,
Miham škinuŭ ŭsio, raździeŭsia,
Sam raptoŭna raźlacieŭsia,
Ŭ kacioł skočyŭ toj paroju
I schawaŭsia z haławoju...
Małako kipić, bušuje.
Kniaź lichija plany snuje;
Adnak Janka toj paroju
Wylez z całaj haławoju!

Narod achnuŭ, dziwu daŭsia.
Ale Janka razahnaŭsia,
Ŭ druhi zara pieraskoča —
Haławu z nahami moča.
Choć wada kipić, choć waryć,
Jak ahoń waratak paryć,
Adnak Janka toj paroju
Wylez z całaj haławoju.
Pośle Janka jak-by z mostu
Skočyŭ zara ŭ wadu prostu.
A, jak wylez, byŭ jak nowy:
Wusny, twar — byli ružowy;
Sam uwieś admaładzieŭšy,
Tolki kryšačku spacieŭšy.
Ludzi, dzieci bili brawa;
Pahladali tak łaskawa,
Tak wiasioła hamanili —
Na rukach jaho nasili.
Čar-caryca to-ž hladzieła.
A na kniazia nie chacieła
Nawat hlanuć, na staroha.
Kliknie Janku maładoha,
Z im łaskawa razmaŭlaje,
I śmiajecca i pytaje —
Heta-inša, toje-sioje...
Kniaź razhniewaŭsia zatoje:
Jamu zajzdraść lezie ŭ serca,
Jon až moršćycca, hryziecca;
Pośle kaža: „Pačakajcie!
I katłoŭ tych nie čapajcie;
Ja to ž budu raździawacca,
Chaču tak-ža pakupacca".
Woś dwaranie kali skočuć,
Zara kniazia skupać chočuć.
Kniaź kašulu tolki skinie;
„Małako, kryčać, astynie!"
Kniaź dryžyć, až žmuryć wočy,
Ŭ katle palec pierš pamoča,
Až araryŭ, narakaje,
Ŭ kacioł lezie, to čakaje...
Woś nareśćie, naastatak,
Skočyŭ kniaź u toj waratak,
I, jak buchnuŭ toj paroju,
Dyk schawaŭsia z haławoju!
Až na dno pašoŭ z razmachu.
Ludzi achnuli sa strachu,
Na kacioł toj pahladajuć,
I čakajuć i čakajuć...
Tak čakali mo' z hadzinu
I druhoje paławinu.
Ažno kniaź, jak raz schawaŭsia,
Dyk saŭsim nie pakazaŭsia.
Jak zwaryŭsia, hetym znakam,
Kości kinuli sabakam...

* * *

Tak woś kniaź naš pakupaŭsia!
Hety płakaŭ. toj śmiajaŭsia...
Ažno kažuć usie ludzi:
„A chto kniaziem ciapier budzie?"
Kruhom stali razhladacca
I adny druhich pytacca.
Woś-ža radu jak zrabili,
Miž saboj pastanawili,
Što kniažnoju maje byci
Krasna, hoža Čar-caryca,
Bo jana razumna duža —
I dać Janku joj za muža.
Woś, jak skončyłaś narada,
Čar-caryca była rada:
Janku wielmi palubiła
I usim jaho chwaliła.
Ech, wiasiellie zahulali!
I ja byŭ na hetym bali:
Jeŭ i piŭ ja za čaćwiora,
Tak siahońnia, jak učora;
Pa wušach wino spływała,
Dy u rot mnie nie papała!
Wypiŭ bočku miodu, piwa...
Adnak piwa — niejka krywa:
Choć kruhom minie liłosia,
Dyj u hubie nie znajšłosia.
Tolki tym ja skarystaŭsia,
Što woś smačna ablizaŭsia...
Byŭ ja, značyć, hość pryhodny
I damoŭ pryšoŭ hałodny.
A, nia majučy zapasu,
Wypiŭ dobry kubak kwasu.
Dastaŭ pośle sa dna bočki
Dwa chudzieńki ahuročki:
Zakusiŭ tak dla zabaŭki
I zachrop na ŭsie zastaŭki!

Kaniec.

Да нас пішуць.

„ДРУЖБА“ ДВАРА З ВЁСКАЙ.

Палачаны, Маладэчанскага павету. У Палачанскай гміне найбольшым абшарнікам ёсьць Вацлаў Сьвентаржэцкі, уласьнік 4-ох вялікіх двароў: Якімоўшчына, Палачаны, Рачкова і Кучукі. Гэты пан пралажыў сабе найпрасьцейшую дарогу ад двара Якімоўшчына да двара Рачкова праз поле сялян вёскі Быкі і за гэта спачатку кожны год даваў сялянам на пашу сваё балотца, каторае граніччыцца з вясковай зямлёй.

У 1929 г. п. С. скасаваў усе іншыя прыватныя дарогі лучачыя Рачкова з Якімоўшчынай ды раўняючы граніцы, адарваў кавцы ніваў сялян вёсак: Канюхі, Журавічы і Быкі. Заварушыліся сяляне, пачалі нараджацца якбы падаць у суд абшарніка. Але з гэтага нічога ня вышла, бо сяляне ня мелі грошай судзіцца з абшарнікам.

У 1930 г. абшарнік С. загарадзіў калючым дротам тое балотца, каторае аддаваў што год сялянам за дарогу, кажучы, што дарога зайшла ў даўнасьць, а калі сяляне ня пусьцяць яго ехаць, дык на гэта ёсьць паліцыя. Тады сяляне выкапалі равы на сваіх грунтох, каб абшарнік С. па іх полі ня ехаў.

На другі дзень у вёску прыехала паліцыя з Палачан і давай пісаць пратаколы. Паставілі пастарунак на дарозе, даючы праезд Сьвентаржэцкаму, а сяляне капалі новыя равы на сваім полі і гэткім чынам касавалі дарогу зробленую на іх грунце абшарнікам Сьвентаржэцкім.

Справа перайшла ў павет. З Маладэчна прыяжджала нейкая камісія, якая разабраўшыся канчальна скасавала дарогу абшарніку Сьвентаржэцкаму па сялянскіх грунтох.

У гэтым годзе ўзышла на зімовую ральлю—голы папар двара Якімоўшчына—сялянская скаціна. Тут сам абшарнік С. з цэлай сваей сьвітай аканомаў, старажоў і фурманоў конна напаў на пастухоў, з рэвольверам у руках, худобы не забіраў у хлеў, як гэта рабіў у прошлыя гады, але паздымаў з жывёлы павады, вуздэчкі і лапцугі.

Калі-ж сяляне звярнуліся ў двор з просьбай аддаць ім „сканфіскаваныя“ рэчы, дык абшарнік С. загадаў заплаціць па 1 зл. ад штукі кары.

Абшарнік Сьвентаржэцкі вагонамі адсылае сваё збожжа і пашу, а ягоныя суседзі з голаду пухнуць; пойдзі да яго на работу — ня прымае, бо кажа работы няма; і праўда — арэць, драпачуе і барануе трактарамі-машынамі, ездзе аўтамабілямі, дык яму мала людзей і трэба, а злові́ць каня ці карову на сваім папары, дык трымае покуль заплаціш яму кару ад 1 да 10 зл. за штуку.

Дарогі гмінныя, каторыя праз дзяцьміж дворных палёў, абшарнік Сьвентаржэцкі аддае ў арэнду сваім суседзям-сялянам, а як трэба правіць гэтыя дарогі, дык сяляне правяць шарваркам.

Дык вось як жывецца ў нашай старонцы. М. Палачанокі.

„СУСЕДЗКІЯ“ АДНОСІНЫ ДВАРА.

Міроўшчына, Наваградзкага пав. Аб адносінах двара да суседніх вёсак ужо пісалася ў „Б. Крыніцы“ ня раз, але трэба пісаць і больш. Як толькі прыгрэе сонейка і маці зямелька пакрыецца зеленяй, двор зараз-жа натапурываецца і пачынаюцца сваркі між дворам і акалічнымі вёскамі.

Гэтак было мінулае лета, гэтак пачалося і сёлета. Не пасьпелі сяляне выгнаць скаціны з хлява ў поле, а ўжо калатня двора з вёскамі і пачалася. Ведама, сялянскія нівукі вузенькія, бо дворныя палеткі шырокія, дык ніяк сялянская карова не ўсьцеражэцца, каб ня ўзыйсьці на дворнае поле, або сенажаць. А карова, ведама жывёла, яна не разумее таго, што дворны пан гэта ня наш брат-селянін, з якім можна ўсяляк гаварыць, дык яна туды і лезе, дзе больш зялёна. Ведае аб гэтым і дворны пан і дзеля гэтага наняў ён адумыснага дворнага чыноўніка, які толькі тое і робіць, што запісвае, колькі разоў узышла сялянская карова на панскі луг, або папар.

Гэтыя запісы разглядае сам дворны пан, а пастанова панская заўсёды аднолькавая: або згаджайся селянін на „прысуд“ пана адрабіць некалькі дзён у двары за нахальства своей каровы, або йдзі ў суд за самавольную „пашу“ на дворнай зямлі. Селянін наш, як ведама, каб мець менш цяганіны, згаджаецца заўсёды на панскую „ласку“.

Сьлёзнавокі.

АРЫШТЫ.

В. Бухаўшчына, Нясьвіскага пав. У нас 19 V. с. г. адбыліся арышты. Арыштаваных было 17 асоб. Прычынай арыштаў было непаразуменьне сялян з тэхнікам, які праводзіць у нас мэліорацыю. З гэтага непаразуменьня дайшло да забастоўкі, у якую ўмяшалася паліцыя, а ў выніку ўсяго гэтага дайшло і да арыштаў. Пасьля арыштаў прасьледзілі ўсю гэту справу судова-сьледчыя ўлады і арыштаваных зволынілі. Між арыштаванымі ў гэтай справе апынуліся больш дзейныя беларусы, якія стойка дамагаліся беларускай школы і тыя што кіруюць у нас беларускай народна культурнай працай. У гэтым ліку арыштаваных быў і І. Мартыпонак, які вельмі актыўна працуе на ніве беларускай народнай асьветы.

М. П.

АБ НАШЫМ КАМАНДАНЦЕ „СТШЭЛЬЦА“.

Мёры, Браслаўскага пав. Ёсьць у нас у в. Русачкох дужа „разумны“ камандант стральцоў, Антон Ювэль, які свае начальніцкія здольнасьці праявіў б'ючы жанчыну стрэльбай, а сваю суседку В. Радзімшчынку — жалезным прутом. Справа апынулася ў Акружным Судзе у Браслаўі. Не памаглі тут абвінавачанаму ані яго пахвалкі, што ён камандант, ані тое, што ён паводыр, ані тое, што ён падтрымлівае польскую культуру. „Усыпалі“ месяц арешту ды і толькі. Пасядзіць, мо' разумнейшы будзе.—Гэтак робіць камандант стральца, а што могуць рабіць яго падуладныя?

Р. Шчабёра.

TREBA BOLŠ AŠČADNAŠCI.

Kimiany, Wil. Trockaha paw. I ŭ našych wakolicach haspadarčy kryzys dobra raspałežyŭsia. Stohnuć našy sialanie ad biedaŭ i niedastatkaŭ, pazirajuć u pryšłaść swajho losu, čakajučy ščašliwiejšaj chwili ŭ swaim harotnym žyćci, a paprawy ŭsio niama i niama. Pradukty sialanskija nie daražejuć, ale ješče taniejuć, a ŭ kramie ničoha nie tanieje. A wiedama, treba adziecca, abucca i šmat inšych jošć patrebaŭ, biez katorych nia možna abyjścisia. Nu dyk što-ž rabić i ad kul čakać ratunku i ŭspamohi? Treba nam samym zastanawicca i padumać ab swaim pałažeńni. Jak widać u nas za šmat jošć raskidu swajho krywawaha hroša na marnyja i niepatrebnyja rečy, jak na wodku, papierosy, łasyja ŭbory. Niama nam što za hetymi rečami ŭhaniacca! Biaz ich možam abyjścisia. Tolki nie aščadžajma na swaju rodnuju hazetu, wypiswajma jaje i čytajma, a jana pakaža jak žyć.

W. P.

Усячына.

Зьмена спосабу выбараў рымскага Папы. Сучасны найвышэйшы Пастыр каталіцкага касьцёла рымскі Папа Піус XI уважаецца ўсімі, як рашучы працаўнік над збліжэньнем паміж каталіцтвам і іншымі хрысьціянскімі веравызнаньнямі. У гэтай працы ён стараецца ня толькі сам быць зразумелым, але іншых разумець.

Доказам гэтага ёсьць вестка, што сучасны Папа мяніцца скасаваць дагэтуляшні спосаб выбараў Папы і завясьці спосаб новы. Паводле дагэтуляшняга спосабу Папу выбіралі самі толькі кардыналы, і гэта нялюба бачылася з боку веравызнаньняў некаталіцкіх.

Цяпер-жа гэтыя выбары мае праводзіць біскупская калегія. Практычнае значэньне гэтае рэформы было-б такое, што на выбары Папы страцяць рашучы дагэтуль уплыў Італьянцы, каторых у кардынальскім сэнаце была заўсёды большасьць, а ў біскупскай калегіі будзе зьвікомая толькі меншасьць (200 супроць 1.500).

Аб абдуваньні.

(*Адказ М. П—скаму*).

Абдуваньне, як хвароба, спатыкаецца ня толькі ў скаціны, але і ў авечак. Безпасярэдняй прычынай абдуваньня зьяўляюцца газы, якія вытвараюцца ў кнігах (трыбусе) скаціны пасьля пашы на маладой канюшыне, або і на іншай сочнай траве, асабліва калі пасьвіцца па расе, бо па дождж ам зьлітым пасьбішчы і да таго — проціў ветру. Абдуваньне бывае або павольнае, або раптоўнае. Ў апошнім выпадку хвароба можа кончыцца сьмерцю скаціны за вельмі кароткі час, нават за поўгадзіны.

Лячэньне ад абдуваньня мусіць кіравацца істотай хваробы. Перш-на-перш нельга дапускаць, каб згаладалая жывёла нараз доўга пасьвілася на клустых пасьбішчах. А калі б так сталася, што абдуваньне ўсё-ж наступіць, дык лячэньне мусіць кіравацца да таго, каб набраныя газы з кнігаў скаціны выдастаць. Спосабаў на гэта ёсьць некалькі. У адным мейсцы памагае адно, у другім — другое. Найпрасьцейшым бадай спосабам ёсьць выклікаваньне ў скаціны штучнага адрыганьня, пры каторым газы з трыбухоў выходзяць праз горла. Такое адрыганьне выклікаецца тым, што бярэцца саламянае перавясла, мажацца мылам, або дзёгцем, укладаецца хворай жывёле ў зубы і завязваецца на галаве за рагамі. — Вытвараньне новых газаў часам затрымоўвае, але вытвораных не выганяе, паліваньне хворай скаціны зімнай вадой.

Калі-ж усе гэтыя захады не памогуць і жывёла відавочна душыцца, траціць жвачку, а левая асабліва пахвіна (гэтак званая галадовая яма) відавочна ўздымаецца, робіцца цьвёрдай і пры пастуківаньні бубніць падобна да бубна, тады трэба рашучага і скорага захаду пры помачы або глытніцавай трубкі, або трокара, або ўрэшце звычайнага, па магчымасьці вузейшага нажа.

Пры ўсякім спосабе ратаваньня скаціны ад абдуваньня трэба яе паставіць так, каб перадок стаяў вышэй, чымся задок.

Глытніцавая трубка, чыста вымытая і змазаная алеем, праводзіцца праз горла скаціны аж у кнігу (жалудак) і такім чынам выводзіць стуль набраныя газы.

Трокар па форме сваей прыпамінае машынку да робленьня папяросаў. Дзейнасьць трокара залежа ў тым, што ім вострапрабіваецца (пракалываецца) кніга з-верху, праз скуру, у мейсцы самага ўздуцьця; пасьля гэтага самае шыла трокара выцягваецца, а праз пачіненую ў скуры і ў кнізе похву трокара набраны ў сярэдзіне газ выходзіць наверх і скаціна адратоўвуецца. Калі газ ужо выйдзе, тады похва трокара таксама выбіраецца, а месца прабіцьця найлепш заляпіць плястрам.

Урэшце, калі пад рукой няма ні глытніцавай трубкі, ні трокара, а скаціна відавочна дажывае свае апошнія гадзіны, памагаюць сабе некаторыя людзі тым, што напнутае мейсца пахвіны і жалудка прабіваюць звычайным нажам і трымаючы ўбіты нож праз гэткую прабоіну выпускаюць набраны газ. Пэўна-ж, гэты апошні спосаб зьяўляецца не заўсёды досьць пэўным, але... калі валіцца галава, па валасох ня плачуць.

Гэткія спосабы ратаваньня скаціны ад уздуцьця знае ветэрынарная мэдыцына. Іншыя спосабы — няпэўныя, а часта і небясьпечныя.

інж. А. К.

З Вільні.

Падазроны напад. Паводле весткі „Бел. Звону“ Nr. 17 „ўночы з 16 на 17 чэрвеня „няведамыя“ людзі, увайшоўшы пры помачы падабранага ключа ў памяшчэньне Цэнтрасаюзу.. учынілі тамака поўны разгром...“ „Падробна“ абгаварываць справу абяцаўся „Бел. Звон“ „у наступным нумары.“

Два тыдні ад гэтага часу мінула і ўсьцяж нельга нешта дачакацца ані „наступнага нумару,“ ані „падрабнага абгаварываньня.“ Затое „злыя языкі“ што-раз выразьней гавораць аб тым, што быццам „узломшчыкі“ сапраўды для „Цэнтрасаюзу“ не зьяўляюцца „няведамымі“ ды што яны „падбіраць ключа“... сусём не патрабавалі... Гавораць...

Як з гэтым ёсьць у сапраўднасьці?

Рэдактар Ян Пазьняк. Бел. Друк. ім. Фр. Скарыны, Вільня. Выдавец А. Шутовіч.